УДК 81.13

# ДА ПЫТАННЯ АБ МЕТАДАЛОГІІ ДАСЛЕДАВАННЯ ТЭРМІНАЛАГІЧНАЙ СІСТЭМЫ

**_Русак В. У., к.ф.н., дац._**

_Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь_

Рэферат. _У рабоце апісаны тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання сучаснай беларускай лесатэхнічнай тэрміналогіі. Разгледжаны навуковыя тэорыі, прынцыпы, метады і прыёмы, якія прымяняюцца для інвентарызацыі, дапаўнення, упарадкавання, сістэматызацыі сучаснай беларускай тэрміналогіі лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці._

Ключавыя словы: тэрмін, тэрміназнаўства, лінгвістычныя метады і прыёмы даследавання, тэорыя намінацый, тэорыя апазіцый.

У сучаснай беларусістыцы ўсё большая ўвага надаецца лінгвістычнаму аналізу спецыяльнай лексікі розных галін ведаў. Аднак, па назіраннях навукоўцаў, «беларуская лінгвістыка характарызуецца прыметнай дыспрапорцыяй у развіцці тэарэтычнага і прыкладнога тэрміназнаўства» [1, с. 3]. Між тым, аб’ектыўнае даследаванне любой навукова-тэхнічнай тэрміналогіі прадугледжвае комплексны аналіз сучаснага складу і стану тэрмінасістэмы ў кантэксце сінхронна-дыяхранічнага ўзаемадзеяння асноўных лінгвістычных тэндэнцый, канцэпцый і кірункаў. У дадзенай працы разгледжаны навуковыя тэорыі, прынцыпы, метады і прыёмы, якія прымяняюцца для інвентарызацыі, упарадкавання, сістэматызацыі і дапаўнення сучаснай беларускай лесатэхнічнай тэрміналогіі.

Надзвычай важным для характарыстыкі асаблівасцей фарміравання і развіцця тэрмінасістэмы з’яўляецца разуменне таго, як тэрмін узнікае ў тэрміналогіі пэўнай галіны ведаў. Для высвятлення таго, як суадносяцца паміж сабой паняційныя формы мыслення, якім чынам утвараюцца, замацоўваюцца і размяркоўваюцца назвы па розных фрагментах навакольнай рэчаіснасці, выкарыстоўваецца тэорыя намінацый. Па назіраннях М. М. Валодзінай, у працэсе тэрміналагічнай намінацыі гістарычна вылучаюцца два этапы: стыхійны і сістэмны. На першым этапе намінатыўная дзейнасць ажыццяўляецца з дапамогай інтэрпрэтацыі названага аб’екта праз прызму суб’ектыўна-аб’ектыўнага ўспрымання з боку таго, хто дае найменне [2, с. 27]. На другім этапе тэрмін разглядаецца як «аб’ект штучнага рэгулявання» [3, с. 30], які ствараецца на аснове ўніфікацыі і стандартызацыі тэрмінаўтваральных сродкаў.

Паколькі ў сферы тэрміналогіі спецыяльная намінацыя адрозніваецца ярка выражаным імкненнем да рэгулярнасці выкарыстання адных і тых жа прыёмаў, мадэлей, аналогій, тэорыя намінацый актыўна выкарыстоўваецца пры даследаванні структуры і ўтварэння тэрмінаў. Для абгрунтавання спосабаў утварэння вытворных тэрмінаў лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці былі задзейнічаны правілы тэрміналагічнага словаўтварэння. Так, у сістэме беларускіх тэрмінаў лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці вылучаны невытворныя і вытворныя тэрміны. Адзначана, што невытворныя тэрміны адначасова функцыянуюць і як элементы агульнаўжывальнай лексікі, і як адзінкі тэрмінасістэмы без змены значэння. Тыповай рысай вытворных тэрмінаў з’яўляецца матываванасць. Утварэнне намінатыўнай адзінкі з новай сэнсавай структурай адбываецца на базе ўжо гатовых адзінак; у структуры новага наймення заўсёды паўтараецца знак або часткі тых знакаў, якія былі ў структуры зыходнай адзінкі; новае найменне не паўтарае цалкам фармальных характарыстык зыходнай адзінкі; утварэнне новага наймення часта з’яўляецца вынікам ажыццяўлення пэўнай фармальнай аперацыі (далучэння афіксаў, іншай асновы або асноў, усячэння якіх-небудзь элементаў і т. п.).

Даследаванне беларускай лесатэхнічнай тэрміналогіі, на наш погляд, немагчыма і без уліку тэорыі апазіцый. Апазітыўны аналіз, які быў першапачаткова распрацаваны на фанетычным матэрыяле, стаў эфектыўным сродкам даследавання і іншых моўных адзінак. У прыватнасці, тэорыя апазіцый М. С. Трубяцкога дазваляе наглядна прадставіць карэляцыю паміж элементамі семантыкі ў значэннях моўных адзінак і такім чынам прадэманстраваць структуру іх значэння. Аналіз семантычных апазіцый з’яўляецца адным з прадуктыўных шляхоў для разумення сістэмнай сутнасці тэрміналагічных з’яў. Як адзначаюць даследчыкі, «семантыка тэрміна ў вельмі вялікай ступені абумоўлена яго

месцам у сістэме паняццяў дадзенай галіны веды, і таму значэнне кожнага асобнага тэрміна каардынавана значэннем іншых тэрмінаў гэтай жа сістэмы» [4, с. 25]. Такім чынам, тэорыя апазіцый дапамагае вызначыць месца тэрміна ў іерархічнай сістэме, выявіць родавыя і відавыя прыметы ў дэфініцыях тэрмінаў лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці, высветліць лексіка-семантычныя адносіны (сінанімічныя, антанімічныя, гіпера-гіпанімічныя) паміж тэрмінамі праз супастаўленне.

Тэрміналагічная праца можа мець некалькі напрамкаў, але ў любым выпадку самым першым і абавязковым з'яўляецца этап інвентарызацыі тэрмінаў, збор усіх тэрмінаў, якія адносяцца да абранай галіны ведаў. Інвентарызацыя павінна грунтавацца на агульных прынцыпах, якія забяспечваюць магчымасць далейшай уніфікацыі тэрміналагічных адзінак на змястоўным, лагічным і лінгвістычным узроўнях. Да такіх прынцыпаў адносяцца:

– прынцып сістэмнасці, які мае перадумовай структурна-семантычную спалучанасць адабраных лексічных адзінак. Гэта азначае, што корпус тэрмінаў фарміруецца шляхам вызначэння структурна-семантычных сувязей (рода-відавых, анатанімічных, сінанімічных, словаўтваральных і г. д.) кожнай тэрміналагічнай адзінкі з іншымі і аб'яднання іх у арганізаваныя групы;

– прынцып дакладнасці: у адпаведнасці з ім з навуковых прац выбіраюцца тыя адзінкі, якія маюць дэфініцыі (адлюстроўваюць спецыфіку паняцця і дазваляюць вылучыць яго сярод сумежных). Відавым адрозненнем павінна быць прымета ці група прымет, уласцівых толькі гэтаму паняццю і адсутных у іншых паняццях, якія адносяцца да таго ж роду;

– прынцып частотнасці, згодна з якім у слоўнік адбіраюцца тыя тэрмінаўтварэнні, якія маюць паўтаральнасць у навуковых тэкстах і (або) энцыклапедычных, лексікаграфічных даведніках;

– прынцып комплекснасці, згодна з якім у слоўнік уключаюцца не толькі вузкаспецыяльныя лесагаспадарчыя і лесапрамысловыя тэрміны, але і звязаныя з імі агульнанавуковыя і міжгаліновыя;

– прынцып рэлевантнасці для сучасных рэалій менавіта Рэспублікі Беларусь, які дазваляе не ўлічваць у слоўніку паняцці, якія знаходзяцца па-за ўнутранай прасторай Рэспублікі. Перш за ўсё, гэта тэрміны, якія адлюстроўваюць нехарактэрныя для Беларусі кліматычныя і ландшафтныя ўмовы, а таксама звязаныя з імі таксоны жывёл, раслін, віды гаспадарчай дзейнасці чалавека і г. д.

Комплексны аналіз беларускіх лесагаспадарчых і лесапрамысловых тэрмінаў забяспечваюць розныя метады даследавання.

Апісальны метад уключае інвентарызацыю, класіфікацыю і інтэрпрэтацыю вывучаемых моўных адзінак і з'яў. Гэты метад ужываецца для характарыстыкі этапаў станаўлення, фарміравання і развіцця беларускай тэрміналогіі лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці, а таксама для апісання тэматычных груп тэрмінаў, гіпера-гіпанімічных адносін паміж тэрмінамі, з'яў сінаніміі, антаніміі, полісеміі, аманіміі, ацэнкі структурных асаблівасцей лесатэхнічных тэрмінаадзінак.

Структурны метад заключаецца ў сінхронным аналізе моўных з'яў. З дапамогай структурнага метаду выяўлены асаблівасці словаўтваральнай структуры аднакампанентных тэрмінаў, устаноўлены структурныя мадэлі шматкампанентных тэрмінаў.

Элементамі структурнага метаду з'яўляюцца кампанентны і дыстрыбутыўны аналіз.

Кампанентны аналіз – гэта сістэма прыёмаў мовазнаўчага вывучэння значэнняў тэрмінаў, сутнасць якой заключаецца ў расшчапленні дэфініцыі тэрміна на састаўныя кампаненты. Ён дазволіў устанавіць элементы семантыкі тэрмінаў лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці, якія паслужылі асновай для фарміравання тэрміналагічнага поля, уключэння тэрмінаў лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці ў пэўныя тэматычныя групы, падгрупы.

Дыстрыбутыўны аналіз прадугледжвае даследаванне мовы на аснове акружэння (дыстрыбуцыі, размеркавання) асобных адзінак у тэксце. З выкарыстаннем гэтага метаду магчыма вызначэнне лексіка-семантычных адносін (сінанімічных, антанімічных, полісемічных, аманімічных) паміж лесатэхнічнымі тэрмінамі.

Метад суцэльнай выбаркі звязаны з адборам намінацый. Тэрміны лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці выбіраюцца са спецыяльных тэрміналагічных слоўнікаў, энцыклапедый і даведнікаў, навуковай літаратуры з улікам семантычных кампанентаў, звязаных з лясной гаспадаркай і лясной прамысловасцю.

У межах адабраных метадаў мэтазгодна ўжыванне такіх прыёмаў, як аналогія, мадэляванне, класіфікацыя, колькасныя падлікі.

Аналогія дапамагае ў атрыманні ведаў аб прадметах або з'явах на аснове іх падабенства з іншымі прадметамі або з'явамі па істотных прыметах. З выкарыстаннем прыёму аналогіі выяўлены словаўтваральныя тыпы аднаслоўных тэрмінаў і структурныя мадэлі тэрміналагічных словазлучэнняў, вызначаны з'явы сінаніміі, антаніміі, полісеміі і аманіміі.

Мадэляванне дазваляе замяніць даследуемы аб'ект яго мадэллю, па якой вызначаюць або ўдакладняюць характарыстыкі арыгінала. Шырока выкарыстоўваецца для даследавання словаўтваральнай структуры аднаслоўных тэрмінаў і вызначэння структурных мадэлей шматслоўных тэрмінаў.

Класіфікацыя выяўляе іерархію навуковых паняццяў і ўзаемаадносін аб'ектаў даследавання. Прымяняецца для падзелу тэрмінаў на тэматычныя групы, падгрупы; выдзялення розных відаў гіпера-гіпанімічных адносін, разнавіднасцей сінонімаў, антонімаў, амонімаў; пацверджання сістэмнасці тэрмінаў.

Прыём колькасных падлікаў дазваляе зрабіць высновы пра багацце тэматычных груп тэрмінаў лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці, частотнасці структурных тыпаў і мадэлей, ступені распаўсюджанасці сінаніміі, варыянтнасці, полісеміі і аманіміі ў лесатэхнічнай тэрміналогіі.

Такім чынам, даследаванне беларускіх лесатэхнічных тэрмінаў абапіраецца на тэарэтыка-метадалагічную базу, якая дапамагае ўпарадкаваць тэрмінасістэму лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці і ўсталяваць сістэмныя сувязі паміж тэрмінамі; забяспечвае атрыманне максімальна аб'ектыўнай і дакладнай інфармацыі пра гісторыю станаўлення, фарміравання і развіцця лесатэхнічнай тэрміналогіі ў беларускай мове.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Дзятко, Д. В. Беларуская матэматычная тэрміналогія: станаўленне, структура, функцыянаванне / Д. В. Дзятко. – Мінск: БДПУ, 2009. – 192 с.
2. Володина, М. Н. О стихийном и системном характере терминологической номинации / М. Н. Володина // STEPHANOS. – 2017. – № 6 (26). – С. 24 – 36.
3. Трубецкой, Н. С. Основы филологии / Н.С. Трубецкой. – М.: Аспект Пресс. – 2000. – 352 с..
4. Комарова, З. И. Семантическая структура специального слова и ее лексикографическое описание / З. И. Комарова. – Свердловск: Изд-во Уральского ун-та, 1991. – 156 с.

УДК 141.32:355.01

## ЭКЗИСТЕНЦИАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ВОЙНЫ

***Рыбаков В. Е., студ., Ростовская О. М., к.ф.н., доц.***

*Витебский государственный университет имени П. М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

Реферат. *В статье на примере событий Второй мировой и Великой Отечественной войн рассмотрен ряд философских вопросов, непосредственно связанных с феноменом войны, отсылающем к проблемам смысла человеческого существования, мира, происходящих событий и т.п., вводя тем самым в экзистенциальный кризис, отпечаток которого ощущается на протяжении лет, десятилетий и столетий.*

Ключевые слова: социальная философия, философская антропология, экзистенциальные вопросы, феномен войны, Вторая мировая война, Великая Отечественная война.

Война – одно из страшнейших и тяжелейших событий. Её ужас заключается не только в массовой физической смерти и огромных материальных потерях, но и в разложении духовной сферы человека, угрозе потери смысла высших ценностей и смысла жизни в целом. Обстановка войны создаёт условия для деградации человеческого в человеке и давления на его психику, которое не каждый способен выдержать.

Человек, оказавшийся заброшенным в войну, поглощённым ею не по своей воле, ставит перед собой множество бытийных и смысловых вопросов, погрузившись тем самым в экзистенциальный кризис. Он напрямую сталкивается с феноменами смерти, выбора, мести